для заняткаў па матэматыцы, так і для заняткаў па фінансавай граматнасці, таму што на іх адлюстраваны нацыянальныя сімвалы і артэфакты Беларусі. На працягу заняткаў вучні пазнаёміліся з вялікай колькасцю гістарычных падзей, знакамітых асоб, сімвалаў і помнікаў архітэктуры Беларусі.

На працягу заняткаў вучні разглядалі прыклады купюр, паказаныя на сайце Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, успаміналі ўжо вядомыя цікавыя гістарычныя факты і знаёміліся з новымі. Гутарка таксама ішла пра знакамітых асоб: Францыска Скарыну, Ефрасінню Полацкую. Падчас аповеду настаўніка пра такія помнікі архітэктуры Беларусі, як Камянецкая вежа ў г. Камянец, Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку, палац Румянцавых і Паскевічаў у Гомелі, Мірскі замак у г. п. Мір, замак Радзівілаў у Нясвіжы, Магілёўскі абласны мастацкі музей імя Т. В. Масленікава, Нацыянальная бібліятэка ў Мінску, дзеці распавядалі, як яны ездзілі на экскурсіі, і адзін аднаму расказвалі факты і моманты наведвання гэтых месцаў. Таксама дзецям было цікава пазнаваць пра сімвалы і прадметы, адлюстраваныя на пярэднім і адваротным баках купюр, яны ўважліва слухалі пра драўлянае кола, Тураўскае Евангелле, батлейку, ліру і лаўровыя галінкі, пяро, паперу, нотны стан і іншыя рэчы. Такім чынам мы змаглі зацікавіць дзяцей і за кароткі час заняткаў пазнаёміць іх з вялікай колькасцю помнікаў архітэктуры, сімвалаў і гістарычных падзей, якія адлюстраваны на сучасных беларускіх купюрах.

# Якія папяровыя грошы ў Беларусі зараз?*

## Цыкл сцэнарыяў заняткаў для III класа «У свеце фінансаў» (Працяг. Пачатак у № 1–3/2023.)

**МЭТА:** пазнаёміць з сучаснымі беларускімі купюрамі.

**ЗАДАЧЫ:** ***у рамках прадметных вынікаў:*** сфарміраваць уяўленне аб сучасных беларускіх купюрах; пазнаёміць з малюнкамі і сімваламі, намаляванымі на беларускіх купюрах; ***у рамках метапрадметных вынікаў:*** навучыць суадносіць цэлае і часткі, аналізаваць і параўноўваць інфармацыю; фарміраваць уменне прымяняць прыёмы лагічнага мыслення (аналіз, сінтэз, параўнанне, класіфікацыю, абагульненне і інш.), тлумачыць і ўстанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі ў працэсе пошуку рашэння задач з фінансавым зместам; практыкавацца ў кадзіраванні і дэкадзіраванні знакава-сімвалічнай інфармацыі, мадэляванні рэальных сітуацый, звязаных з грашамі; ***у рамках асобасных вынікаў:*** даць магчымасці для авалодання элементарнымі спосабамі самапазнання, ажыццяўлення адэкватнай самаацэнкі сваіх дасягненняў; вучыць усведамляць прычыны поспехаў і няўдач у вучэбнай дзейнасці; аналізаваць і ацэньваць свае ўчынкі і ўчынкі іншых людзей у адпаведнасці з прынятымі агульначалавечымі каштоўнасцямі, этычнымі нормамі і правіламі.

**АБСТАЛЯВАННЕ:** мультымедыйная прэзентацыя; каляровыя значкі з выявамі групавых роляў; павялічаныя копіі сучасных беларускіх купюр (банкнот) з сайта Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь; картка «Фініш» для захавальніка часу; карткі са словамі «купюра», «банкнота», прамавугольнікі для запісу наміналу купюр (6 шт. для кожнай групы); карткі з назвамі абласцей Беларусі; карткі з заданнямі і пытаннямі для індывідуальнай і групавой работы; вучэбныя грошы (20 папяровых малюнкаў); карткі з QR-кодам са спасылкай на пазнавальны артыкул; прадметы і мадэль касавага апарата для вучэбнай крамы.

* Заняткі праводзіліся 17 студзеня 2023 года.

### Ход заняткаў

**I. АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ЭТАП.**

*Настаўнік вітае вучняў і прапаноўвае кожнаму, як і на папярэдніх занятках, выцягнуць значок з выявай ролі ў групавой рабоце. Далей вучні займаюць месцы за сталамі згодна з колерам значкоў. (Слайд 1. Пачатак работы.)*

**II. ПРАВЕРКА ДАМАШНЯГА ЗАДАННЯ.**

*Настаўнік пытаецца ў дзяцей, як яны правялі калядныя і навагоднія святы. Таксама ён просіць сказаць, што намалявана на аверсе і рэверсе вучэбнай манеты «санцік». (Слайд 2. Аверс і рэверс вучэбнай манеты «санцік».)*

**III. АКТУАЛІЗАЦЫЯ ВЕДАЎ. МЭТАПАЛАГАННЕ.**

**Настаўнік.** Давайце ўспомнім, пра што мы гаварылі на мінулых занятках. Што такое аверс манеты? Якія малюнкі могуць быць на аверсе? *(Адказы дзяцей.)* Што такое рэверс манеты? Што там можа быць намалявана? *(Адказы дзяцей.)*

*За найлепшыя адказы вучні атрымліваюць у якасці ўзнагароды вучэбныя манеты «санцікі». (Слайд 3. Азначэнні аверса і рэверса манеты.)*

**Настаўнік.** Сёння мы працягнем падарожжа ў свет фінансаў і даведаемся пра сучасныя беларускія папяровыя грошы, якія завуцца купюрамі.

*Настаўнік прымацоўвае на дошку картку са словам «купюра».*

**Настаўнік.** Вы часта наведваеце крамы і ведаеце, што, акрамя манет, у нас ёсць і папяровыя грошы, якія называюцца купюрамі. Замест слова «купюра» можна выкарыстоўваць і іншае слова — «банкнота». Купюра, ці банкнота, — гэта папяровы грашовы знак. *(Слайд 4. Азначэнне купюры.)*

***Работа ў групах. Заданне 1***

**Настаўнік**. Зараз мы падзелімся на 2 групы. *(Дзеці часова мяняюць месцы так, каб атрымаліся 2 групы.)* Я прапаноўваю нашым групам наступныя пытанні *(слайд 5)*:

Чым людзям карысныя манеты, чаму яны могуць быць зручнейшыя за банкноты? Можна сказаць прасцей: якія «плюсы» выкарыстання манет? *(Для групы 1.)*

Чым людзям карысныя купюры, чаму яны могуць быць зручнейшыя за манеты? Якія вы бачыце «плюсы» выкарыстання купюр? *(Для групы 2.)*

*Групы працуюць пэўны час, потым прапаноўваюць свае меркаванні. Настаўнік запісвае на дошку гэтыя меркаванні.*

**Настаўнік**. Так, людзям патрэбныя і манеты, і купюры. Манеты патрэбныя таму, што яны выраблены з металу і могуць выкарыстоўвацца больш доўгі час у параўнанні з купюрамі. Купюры зручныя, таму што яны лягчэйшыя за манеты і іх няцяжка трымаць у кашальку. Ну што ж, сёння мы паразмаўляем пра купюры, якія зараз ужываюцца ў нашай краіне. *(Слайд 6. Тэма заняткаў.)*

**IV. ВЫВУЧЭННЕ НОВАГА МАТЭРЫЯЛУ.**

***Работа ў групах. Заданне 2***

*Настаўнік прапаноўвае вучням сесці як на пачатку заняткаў (у трох групах). Далей ён раздае кожнай групе 6 папяровых прамавугольнікаў і рознакаляровыя алоўкі. Кожная група павінна ўспомніць, якія купюры ёсць у Беларусі, і напісаць на папяровых прамавугольніках наміналы гэтых купюр. Групы працуюць, захавальнікі часу паказваюць картку «Фініш», калі заданне выканана. Вучні па чарзе прымацоўваюць на дошку падрыхтаваныя карткі з запісамі наміналаў купюр.*

**Настаўнік**. У нашай краіне выкарыстоўваюцца купюры вартасцю 10 рублёў, 20 рублёў, 50 рублёў, 100 рублёў, 200 рублёў, 500 рублёў. Давайце мы пазнаёмімся з купюрамі бліжэй. Ці ведаеце вы, што пяць купюр прысвечаныя абласцям Беларусі, а адна з купюр — гораду Мінску? *(Слайд 7. Вобласці Беларусі на геаграфічнай карце.)*

**Настаўнік**. Давайце размесцім назвы абласцей нашай краіны ў алфавітным парадку. Для гэтага ўспомнім, у якім парадку ідуць літары ў алфавіце. *(Настаўнік звяртае ўвагу на рад літар у алфавітным парадку на дошцы.) (Слайд 8. Вобласці Беларусі.)*

*Настаўнік разам з дзецьмі прымацоўвае на дошку карткі з назвамі абласцей у алфавітным парадку. Вынікі работы суадносяцца з адпаведным слайдам прэзентацыі. (Слайд 9. Назвы абласцей Беларусі ў алфавітным парадку.)*

**Фізкультхвілінка**

*Вучні танцуюць разам з героямі мультфільма «Фіксікі».*

**Настаўнік**. Дапоўнім наш спіс абласцей горадам Мінскам — сталіцай Беларусі. *(Слайд 10. Назвы абласцей Беларусі ў алфавітным парадку і горада Мінска.)* Вартасць купюр суадносіцца з кожнай вобласцю такім чынам: назвы абласцей мяняюцца ў алфавітным парадку, вартасць купюры мяняецца ў парадку павелічэння ад меншай да большай. Давайце разам размесцім карткі з вартасцю купюр, якія вы зрабілі раней, побач з адпаведнай вобласцю нашай краіны. Улічваем, што апошнім у спісе стаіць горад Мінск.

*Настаўнік прапаноўвае вучням па чарзе выходзіць да дошкі і прымацоўваць карткі з наміналам купюр побач з назвай адпаведнай вобласці. Правільна выкананае заданне выглядае на дошцы так:*

| | |
|---|---|
| Брэсцкая вобласць | 5 рублёў |
| Віцебская вобласць | 10 рублёў |
| Гомельская вобласць | 20 рублёў |
| Гродзенская вобласць | 50 рублёў |
| Магілёўская вобласць | 100 рублёў |
| Мінская вобласць | 200 рублёў |
| Мінск | 500 рублёў |

**Настаўнік**. Але на самой справе тут ёсць адна акалічнасць. На беларускай мове па алфавіце трэба размяшчаць спачатку назву Магілёўскай вобласці (другая літара — «а»), а потым — Мінскай (другая літара — «і»). Але на рускай мове мы пішам «Могилевская» (другая літара — «о»), таму на рускай мове спачатку ідзе слова «Минская» (другая літара — «и»), а потым «Могилевская» (другая літара — «о»). Паглядзіце: зараз мы на дошцы і на слайдзе памяняем гэтыя назвы абласцей. *(Слайды 11, 12. Назвы абласцей Беларусі і горада Мінска ў новым парадку.)* Вось чаму на самай справе паслядоўнасць купюр, прысвечаных Мінскай і Магілёўскай абласцям, іншая:

| | |
|---|---|
| Мінская (Минская) вобласць | 100 рублёў |
| Магілёўская (Могилёвская) вобласць | 200 рублёў |

Параўнаем нашу работу з узорам на слайдзе. *(Выпраўленае заданне суадносіцца з узорам на слайдзе.)* *(Слайд 13. Вобласці Беларусі і горад Мінск, беларускія купюры.)*

На банкнотах можна ўбачыць малюнкі і надпісы. На малюнках адлюстраваны памятныя мясціны і гістарычныя будынкі Беларусі, а таксама нацыянальныя сімвалы, якія абазначаюць з'явы і культурныя аб'екты нашай краіны. Разгледзім купюры падрабязней. Зараз я раздам кожнай групе копіі купюр, атрыманыя з сайта Нацыянальнага банка Беларусі [9]. Пачнём работу з купюр вартасцю 5 і 10 рублёў. Вызначце, што там намалявана. *(Настаўнік раздае кожнай групе копіі купюр вартасцю 5 і 10 рублёў.)* *(Адказы дзяцей.)* Мы памятаем, што купюра вартасцю 5 рублёў прысвечана Брэсцкай вобласці. На пярэднім баку купюры мы бачым Камянецкую вежу. На адваротным баку купюры — калаж, прысвечаны старажытным паселішчам славян (фрагмент скуранога пояса, драўлянае кола, выява старажытнага дзяцінца Бярэсце). *(Слайд 14. Брэсцкая вобласць. Купюра вартасцю 5 рублёў.)*

*Настаўнік знаёміць вучняў са словамі «калаж» і «дзяцінец», паказвае на слайдах малюнкі ў якасці прыкладаў. (Слайд 15, 16. Калаж. Дзяцінец.)*

**Настаўнік**. Купюра вартасцю 10 рублёў прысвечана Віцебскай вобласці. Пярэдні бок купюры — гэта малюнак Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку. Адваротны бок купюры — гэта калаж, прысвечаны асветніцтву і кнігадрукарству (кнігі, знак Францыска Скарыны, крыж Ефрасінні Полацкай, фрагмент арнаменту). *(Слайд 17. Віцебская вобласць. Купюра вартасцю 10 рублёў.)*

Зараз давайце паглядзім уважліва на купюры вартасцю 20 рублёў і 50 рублёў. Што мы на іх бачым? *(Адказы дзяцей.)* Так, купюра ў 20 рублёў прысвечана Гомельскай вобласці. На яе пярэднім баку мы бачым палац Румянцавых і Паскевічаў у Гомелі, а на адваротным баку — калаж, прысвечаны тэме духоўнасці (звон, Тураўскае Евангелле, старажытны горад Тураў, фрагменты разьбы). *(Слайд 18. Гомельская вобласць. Купюра вартасцю 20 рублёў.)* А што вы бачыце на купюры вартасцю 50 рублёў? *(Адказы дзяцей.)* Гэта купюра прысвечана Гродзенскай вобласці. Пярэдні бок купюры — гэта малюнак Мірскага замка, які знаходзіцца ў Гродзенскай вобласці. Адваротны бок купюры — калаж, прысвечаны тэме мастацтва (ліра і лаўровыя галінкі, пяро, папера, нотны стан). *(Слайд 19. Гродзенская вобласць. Купюра вартасцю 50 рублёў.)*

### V. ЗАМАЦАВАННЕ ВЫВУЧАНАГА МАТЭРЫЯЛУ.

***Самастойная работа. Заданне 3***

*Настаўнік прапаноўвае кожнаму вучню самастойна выканаць заданне на картцы:*

Табе трэба набраць 50 рублёў рознымі купюрамі. Прапануй розныя варыянты. Дапоўні малюнкі па ўзоры.

50 рублёў = 5 рублёў + 5 рублёў + 20 рублёў + 20 рублёў
50 рублёў =
50 рублёў =
50 рублёў =

*Настаўнік правярае вынікі работы, адзначае найлепшыя работы. Вучні атрымліваюць у якасці ўзнагароды вучэбныя манеты «санцікі».*

### VI. ВЫВУЧЭННЕ НОВАГА МАТЭРЫЯЛУ (ПРАЦЯГ).

**Настаўнік**. Засталося пазнаёміцца з купюрамі вялікай вартасці — 100, 200 і 500 рублёў. Глядзім уважліва на іх, пачынаючы з купюры вартасцю 100 рублёў. Што мы там бачым? *(Адказы дзяцей.)*

*Настаўнік зноў звяртае ўвагу на тое, што па алфавіце трэба зараз размяшчаць назву Магілёўскай вобласці. Але на рускай мове мы пішам «Могилевская» (другая літара — «о»), таму на рускай мове спачатку ідзе Мінская вобласць (другая літара — «і»).*

**Настаўнік**. Купюра вартасцю 100 рублёў прысвечана Мінскай вобласці. На пярэднім баку купюры намаляваны замак Радзівілаў у Нясвіжы, горадзе ў Мінскай вобласці. На адваротным баку купюры — калаж, прысвечаны тэме тэатра, народных свят і нацыянальных каштоўнасцей (скрыпка, бубен, жалейка, слуцкія паясы, сімвалы народных свят: калядная зорка і каза, батлейка). *(Слайд 20. Мінская вобласць. Купюра вартасцю 100 рублёў.)*

Купюра ў 200 рублёў прысвечана Магілёўскай вобласці. На пярэднім баку купюры мы бачым Магілёўскі абласны мастацкі музей імя Т. В. Масленікава. На адваротным баку купюры — калаж, прысвечаны тэме рамяства і горадабудаўніцтва (залаты ключ і пячатка Магілёва, кафля, фрагменты кованай рашоткі). *(Слайд 21. Магілёўская вобласць. Купюра вартасцю 200 рублёў.)*

Купюра самай вялікай вартасці — гэта купюра ў 500 рублёў. Яна прысвечана гораду Мінску. Пярэдні

бок купюры — гэта малюнак Нацыянальнай бібліятэкі ў Мінску. Адваротны бок купюры — калаж, прысвечаны тэме літаратуры (пяро, чарнільніца, вокладка кнігі, ліст папараці). *(Слайд 22. Мінск. Купюра вартасцю 500 рублёў.)*

### VII. ЗАМАЦАВАННЕ ВЫВУЧАНАГА МАТЭРЫЯЛУ.

***Самастойная работа. Заданне 4***

*Настаўнік прапаноўвае кожнаму выканаць заданне:*

У бацькоў Міколкі 500 рублёў адной купюрай. Яны хочуць набыць сыну заплечнік за 70 рублёў і куртку за 150 рублёў. Якімі купюрамі прадавец можа даць бацькам Міколкі рэшту? Запішы розныя варыянты.

Варыянт 1: ______________________________
Варыянт 2: ______________________________
Варыянт 3: ______________________________
Варыянт 4: ______________________________
Варыянт 5: ______________________________

*Настаўнік правярае вынікі, адзначае найлепшыя работы. Вучні атрымліваюць у якасці ўзнагароды вучэбныя манеты «санцікі».*

### VIII. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ ЗАНЯТКАЎ.

**Настаўнік**. Паўлінка і Міколка хацелі б даведацца, ці ўсё вам было зразумела на занятках. Абмяркуйце ў групах адказы на пытанні, потым спікер прадставіць меркаванне групы. *(Настаўнік раздае пытанні на картках кожнай групе.) (Слайд 23. Пытанні да груп.)*

1 група: «Што такое купюра і чым яна зручнейшая за манету?»

2 група: «Якія беларускія купюры вы ведаеце?»

3 група: «Якія малюнкі можна ўбачыць на пярэднім і адваротным баках беларускіх купюр?»

*Пасля абмеркавання групы прапаноўваюць свае адказы на пытанні.*

### IX. РЭФЛЕКСІЯ.

**Настаўнік**. Якое заданне было самае цікавае? Чаму? *(Адказы дзяцей.)* Якое заданне было самым цяжкім? Чаму? *(Адказы дзяцей.)* Зараз кожны з вас можа на заробленыя вучэбныя грошы купіць што-небудзь у нашай вучэбнай краме.

*Настаўнік прапаноўвае вучням купіць за вучэбныя грошы цікавыя рэчы (памяткі па алгарытмах вылічэнняў, закладкі для кніг) па рознай цане (1 санцік, 2 санцікі і 3 санцікі). Выкарыстоўваецца мадэль касавага апарата, ярлыкі з цэнамі, чэкі аб аплаце.*

### X. ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ.

*Настаўнік прапаноўвае дзецям пазнаёміцца з інфармацыяй па QR-кодзе пра манеты і купюры розных краін, на якіх намаляваны кветкі. На наступных занятках трэба будзе расказаць пра манету ці купюру, якая спадабалася. Кожны вучань атрымлівае картку з QR-кодам са спасылкай на артыкул.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Сендер, А. Н. Исторический материал на уроках в начальной школе / А. Н. Сендер, Т. В. Ничишина. — Минск : Пачатковая школа, 2010. — 144 с.
2. Токарева, Т. А. Об «Историческом и практическом трактате по алгебре» Джона Валлиса / Т. А. Токарева // Историко-математические исследования. — М. : Наука, 1983. — № 27. — С. 146–163.
3. Пуанкаре, А. О науке / А. Пуанкаре ; под ред. Л. С. Понтрягина. — М. : Наука, 1990. — 736 с.
4. Ахмедов, О. С. Преимущества историко-генетического метода при обучении математике / О. С. Ахмедов // Scientific progress. — 2021. — Volume 2. — Issue 4. — С. 523–530.
5. Jankvist, U. T. Developing mathematical knowledge for teaching teachers: potentials of history of mathematics in teacher educator training [Electronic resource] / U. T. Jankvist, K. M. Clark, R. J. Mosvold // Math Teacher Educ 23. — P. 311–332. — Mode of access: https://doi.org/10.1007/s10857-018-09424-x. — Date of access: 10.03.2023.
6. Barbin, É. History of Mathematics and Education [Electronic resource] / É. Barbin, D. Guillemette, C. Tzanakis // Encyclopedia of Mathematics Education. - S. Lerman (eds). — Springer, Cham. — Mode of access: https://doi.org/10.1007/978-3-030-15789-0_69. — Date of access: 17.02.2023.
7. Мураўёва, Г. Л. Матэматыка : вучэб. дапам. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : у 2 ч. Ч. 1 / Г. Л. Мураўёва, М. А. Урбан. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2022. — 136 с.
8. Мураўёва, Г. Л. Матэматыка : вучэб. дапам. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : у 2 ч. Ч. 2 / Г. Л. Мураўёва, М. А. Урбан. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2022. — 136 с.
9. Находящиеся в обращении банкноты Национального банка [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.nbrb.by/coinsbanknotes/banknotes. — Дата доступу: 11.01.2023.



**М. А. УРБАН,**
прафесар кафедры
прыродазнаўчых дысцыплін БДПУ,
д. п. н., дацэнт, кіраўнік СНДЛ «Continuum»;

**Г. Л. МУРАЎЁВА,**
загадчык кафедры
прыродазнаўчых дысцыплін БДПУ,
к. п. н., дацэнт;

**М. Д. СЯРГЕЕВА,**
студэнтка III курса факультэта
пачатковай адукацыі БДПУ,
СНДЛ «Continuum»




*У мультымедыйным дадатку — прэзентацыя.*